УДК 94(476)»15»

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ФУНДАТАРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ А. ГАШТОЛЬДА ВА ЎЛАСНЫХ МАЁНТКАХ (ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XVI ст.)

**Булаты Павел Юр'евіч,**
Інстытут менеджменту спорту і турызму (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны фундатарскай дзейнасці А. Гаштольда. Разглядаюцца заснаваныя магнатам каталіцкія парафіі, іх матэрыяльнае забеспячэнне. Увага надаецца фундатарскай дзейнасці як механізму захавання родавай памяці і павышэння ўласнага прэстыжу і статуснасці.*

Альбрэхт Гаштольд († 1539) – першы пасля вялікага князя чалавек у ВКЛ эпохі пачатку XVI ст., які на піке кар'еры (з 1522 г.) займаў ключавыя ў дзяржаве пасады ваяводы віленскага і канцлера ВКЛ, з'яўляўся адным з самых заможных магнатаў ВКЛ: валодаў вялікай латыфундыяй [1], з якой выстаўляў у 1528 г. у войска 466 коннікаў (больш за ўсіх у дзяржаве [2, с. 13]). Акрамя таго, як саноўнік прыбліжанага да манарха колу, А. Гаштольд прымаў удзел у Венскім кангрэсе 1515 г. [3, с. 386], меў стасункі з манаршымі дварамі Еўропы, як вынік таго – атрыманне ад імператара Святой Рымскай імперыі Карла V у 1530 г. заходняга саслоўнага тытула граф з Мураваных Геранёнаў.

Эпоха, у якую жыў і дзейнічаў А. Гаштольд, – час фарміравання новай эліты ВКЛ. У гэты час трансфармуюцца погляды знаці на свет, з'яўляецца феномен захавання родавай памяці. Так, у XV ст. у ВКЛ заможныя прадстаўнікі знаці клапаціліся пра захаванне памяці пра сябе і свой род, якая праяўлялася праз пэўныя матэрыяльныя рэчы ці вобразы. Для эліты ВКЛ дадзеная практыка паўнавартасна рэалізоўвалася ў царкоўным асяроддзі. Захаванне доўгатэрміновай памяці пра род адбывалася часцей за ўсё праз памяць царкоўную, якая перарастала ў культурную памяць [2, с. 24].

Захаванне памяці адбывалася праз фундацыі царкоўных інстытутаў. Дзейнасць на гэтым прагоне А. Гаштольда яскрава адлюстроўвае акрэсленую тэзу: канцлер актыўна падтрымліваў заснаванне і будаўніцтва новых каталіцкіх парафій. Адзначым цікавую акалічнасць эпохі. Асноўныя фундацыі А. Гаштольда прыйшліся на 1530-я гг. – апошнія «спакойныя» часы Каталіцкага Касцёла ў ВКЛ: у Еўропе набірала абароты Рэфармацыя, якая праз дзесяцігоддзе закране і тутэйшыя землі.

На сваіх падуладных землях фундатарская дзейнасць А. Гаштольда на карысць Каталіцкай Царквы праяўлялася ў двух асноўных напрамках: заснаванне новых парафій, падтрымка парафіі ў родавай рэзідэнцыі.

Паводле падлікаў польскага даследчыка Е. Ахманьскага, канцлер Гаштольд фундаваў 4 новыя каталіцкія святыні ў ВКЛ [4, с. 69]. Гэта храмы ў *Даўгелішках* (1526; суч. вёска Ігналінскага раёну Уцянскага павету, Літва), *Раканцішках* (суч. раён Новая Вільня ў гарадской рысе Вільні), *Сідры* (1535; суч. вёска ў складзе склад Сакульскага павета, Польшча) і *Ляхавічах* (1535; суч. горад у Брэсцкай вобл., Беларусь). У кампаратыўным плане колькасць фундаваных Гаштольдам храмаў – адносная. У параўнанні з фундацыямі Радзівілаў, якія ўзвялі 14 касцёлаў, колькасць фундацый Гаштольда выглядае сціпла, але ў параўнанні



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з іншымі родамі (па тры фундацыі ў Пацаў, Клачкоў, Зяновічаў, у астатніх – менш), то фундацыі Гаштольдаў уражваюць [4, с. 68–69].

Як правіла, пры заснаванні новай парафіі, вяльможныя фундатары клапаціліся пра яе матэрыяльны стан і выдзялялі на яе ўтрыманне пэўныя грашовыя сумы альбо перадавалі на матэрыяльнае забеспячэнне ўласную маёмасць. У часы Гаштольдаў галоўнай крыніцай даходу касцёлаў была зямля з падданымі, якія выплачвалі даніну. Адпаведна, колькасцю гаспадарак (дымоў) вызначалася ступень заможнасці парафіі і памер яе даходаў, якія накіроўваліся на ўтрыманне плябана і парафіі [4, с. 100-101].

Звернем увагу на матэрыяльны стан парафій, фундаваных А. Гаштольдам. Паводле звестак, прыведзеных Е. Ахманьскім, матэрыяльны стан адзначаных парафій наступны: Даўгелішкі – 9 дымоў; Ляхавічы – 8 дымоў; Раканцішкі – 3 дымы; Сідра – звесткі не прадстаўлены [4, с. 104]. Дадзены расклад маёмасці дазваляе аднесці гэтыя парафіі, паводле класіфікацыі Е. Ахманьскага, да самых бедных у ВКЛ (у гэтай катэгорыі прадстаўлены 99 парафій з 217 выяўленых даследчыкам [4, с. 105]).

Аднак кардынальным чынам адрозніваўся матэрыяльны стан каталіцкай парафіі ў Мураваных Геранёнах. Так, тамтэйшы каталіцкі прыход меў у сваім уладанні 131 дым [4, с. 102], што дазволіла Е. Ахманьскаму аднесці яго ў групу самых заможных парафій ВКЛ [4, с. 102]. Пры гэтым у дадзенай катэгорыі геранёнская парафія – адзіная, якая паўстала і забяспечвалася прадстаўнікамі магнатэрыі, іншыя парафіі ў лічбе 5 з’явіліся пры манаршай падтрымцы. Пры гэтым касцёлу ў Геранёнах Гаштольд забяспечыў яшчэ і атрыманне сталых матэрыяльных прыбыткаў [5, Nr. 193].

Такая істотная забяспечанасць парафіі ў Геранёнах тлумачыцца фактам: Мураваныя Геранёны былі рэзідэнцыяй графскага роду Гаштольдаў. Пасля атрымання еўрапейскіх свецкіх тытулаў, прадстаўнікі знаці пачалі фармаваць свае родавыя рэзідэнцыі на ўзор эліты Заходняй Еўропы. Складнікамі такой рэзідэнцыі, паводле даследчыцы Н. Скеп’ян, былі: замак, касцёл (ці кляштар), высокі ўзровень культуры [6, с. 60]. Высокі ўзровень культуры ў рэзідэнцыі падтрымліваўся праз дзейнасць царкоўных інстытутаў, якая адлюстроўвала высокі ўзровень культурна-рэлігійнага жыцця мясцовасці. У ваю чаргу заможны стан і ўзровень сацыяльна-культурнага жыцця парафіі залежалі ад фундатарскай падтрымкі знаці, што стварала ўмовы для дабрачыннай і адукацыйнай дзейнасці парафіі. Дзякуючы гэтаму царкоўныя ўстановы здзяйснялі ў маёнтку рэпрэзентацыйныя функцыі і функцыі па захаванні родавай памяці, касцёл станавіўся статусным і прэстыжным месцам для родавых урачыстасцей (яскравы прыклад, звязаны з родам Гаштольдаў, – урачыстае вяселле ў геранёнскім касцёле Станіслава Гаштольда і Барбары Радзівіл у 1537 г.). Статуснае становішча касцёла ў рэзідэнцыі вызначала прэстыжны статус магната.

У кантэксце захавання родавай памяці паказальным з’яўляецца выпадак, звязаны з фундацыяй касцёла ў Ляхавічах. У адрозненні ад іншых фундаваных А. Гаштольдам парафій, у ляхавіцкім касцёле вяльможа ўвасобіў і замацаваў у падуладнай прасторы сваё імя. Адбылося гэта праз тытул святыні: ляхавіцкі касцёл быў асвечаны ў гонар Св. Войцеха (ён жа – Адальберт Пражскі), які з’яўляўся нябесным апекуном Альбрахта Гаштольда [7, арк. 195–200].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, звярнуўшы ўвагу на некаторыя аспекты фундатарскай дзейнасці А. Гаштольда, можна адзначыць наступнае:

1) актыўная фундатарская дзейнасць – сведчанне фармавання новага тыпу эліты ВКЛ, вяльможы, якому важна падтрымка царкоўных інстытутаў і іх па-за духоўныя функцыя (статуснасць, захаванне памяці);

2) у сваёй графскай рэзідэнцыі А. Гаштольд забяспечыў касцёл вялікімі і рознымі матэрыяльным рэсурсамі, што дало магчымасць духоўнай установе выконваць рэпрэзентацыйныя функцыі;

3) заснаваныя каталіцкія парафіі ва ўладаннях А. Гаштольда не належалі да заможных, але на іх таксама ўскладалася роля па захаванні і трансляцыі родавай памяці праз тытул святыні (прыклад ляхавіцкага касцёла Св. Войцеха).

## Літаратура


1. Kuźmińska, M. Olbracht Marcinowicz Gasztold / M. Kuźmińska // Ateneum Wileńskie. – 1927. – Rok IV. Z. 13. – S. 316–389.
2. Пятраўскас, Р. Чаму вымірае магнатэрыя: лёсы магнацкіх родаў ВКЛ / Р. Пятраўскас // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 11–26.
3. Stryjkowski, M. Kronika polska, litewska, zmódzka i wszystkiéj Rusi / M. Stryjkowski. – Warszawa, 1846. – 572 s.
4. Ochmański, J. Biskupstwo Wileńskie w średniowieczu / J. Ochmański, – Poznań, 1972. – 118 s.
5. Lithuanian Metrica. Літоўская Метрыка. Lietuvos Metrika : Kn. Nr. 1 (1380–1584). – Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. – 207 p.
6. Скеп'ян, Н. Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім Княстве Літоўскім / Н. Скеп'ян // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII ст.) : зб. навук. прац. – Мінск, 2014. – С. 54–63.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1738. Воп. 1. Спр. 1.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова